# Жыць успамінамі

## і пераняць адказнасць

70-ГОДДЗЕ ЗАСНАВАННЯ
КАНЦЛАГЕРА БУХЕНВАЛЬД

**I. Былыя зняволеныя канцлагера Бухенвальд звяртаюцца да прадстаўнікоў горада Веймара:**

Мы перажылі няволю ў канцлагеры Бухенвальд. Мы далі клятву пабудаваць новы свет, свет міру і свабоды. Мы пакляліся на працягу ўсяго жыцця падрабязна расказваць людзям аб злачынствах нацысцкай Германіі. Мы раскрылі прычыны гэтых злачынстваў і з усёй дакладнасцю назвалі вінаватых. Мы рабілі і робім яшчэ ў цяперашні час усё для таго, каб не дапусціць паўтарэння такіх злачынстваў. Цяпер няма ўжо многіх нашых саратнікаў, а з намі, апошнімі, якія яшчэ засталіся ў жывых, скора знікне жывое напамінанне аб гэтым варварскім тэрарыстычным панаванні нацыял-сацыялістаў.

Калі мы цяпер, 70 гадоў пасля заснавання канцлагера, яшчэ раз прыедзем на гэта месца – месца, дзе нацысты трымалі ў няволі спачатку немцаў, потым барцоў Супраціўлення і праціўнікаў нацысткай Германіі з усіх акупіраваных краін, а затым і яўрэяў, сінці і рома, якія падлягалі знішчэнню, – дык у нас узнікае настойлівае пытанне: Хто будзе расказваць аб злачынствах нацыстаў, хто будзе выступаць процiў неанацыстаў і ўсіх тых, хто адвяргае дэмакратыю і папірае нагамі чалавечую годнасць? Хто будзе выступаць і змагацца замест нас, калі нас ужо не будзе на свеце?

## II. Прадстаўнікі горада Веймара заяўляюць былым нявольнікам канцлагера Бухенвальд:

Мы ніколі не будзем замоўчваць злачынствы нацыял-сацыялістаў. Мы ведаем, што гісторыя нашага горада цесна звязана з развіццём гуманістычнага вобраза чалавека і ўмацаваннем дэмакратыі, але і з знішчэннем усяго чалавечага. Провады ў апошні шлях тых, хто яшчэ здольны паведаміць нам аб злачынствах нацыстаў, не будуць развітаннем з крытычнымі адносінамі да злачынстваў нацыял-сацыялізма. Мы адчуваем поўную адказнасць за тое, каб падтрымліваць памяць аб гэтым і перадаваць гэта далей з пакалення ў пакаленне.

Мы вітаем Вас у горадзе Веймаре як раўнапраўных грамадзян і грамадзянак. Ваш прыезд падкрэслівае, што і ў далейшым патрэбна з усей настойлівасцю захоўваць і замацоўваць забарону нацыял-сацыялістычнага светапогляду і клеймаванне ганьбой яго актуальных праяўленняў у нашай дэмакратыі. Ваша доля, Ваша мужнасць, Ваша воля да супраціўлення будуць і ў далейшым кіраваць намі ў нашай рашучай барацьбе процiў усіх відаў вяртання таго, што прывяло к няшчасцю Вас, Вашы родныя краіны і ў канцы канцоў і саму Германію.

На гэтай падставе прадстаўнікі горада Веймара выражаюць у гэтым пісьме свае адносіны да гэтага закліка. Яны абяцаюць зрабіць усё для таго, каб Ваш запавет стаў і яшчэ доўга заставаўся асновай дэмакратычнага самавыяўлення і палітычнай культуры Федэратыўнай Рэспублікі Германіі. Заўсёды і з усіх сіл мы будзем змагацца процiў нацыял-сацыялістычных ідэй, расізма і антысемітызма. Мы ведаем, што правы чалавека, свабода і дэмакратыя не жывуць самі па сабе, і што іх патрэбна практыкаваць кожны дзень і кожную гадзіну і пастаянна абараняць ад нападак.

**Бертран Герц**
ПРЭЗІДЭНТ ІНТЭРНАЦЫЯЛЬНАГА КАМІТЭТА „БУХЕНВАЛЬД-ДОРА І КАМАНДЫ“

**Штэфан Вольф**
ОБЕР-БУРГАМІСТР ГОРАДА ВЕЙМАРА

## III. Падпісванне заявы „Жыць успамінамі і пераняць адказнасць“ Саветам горада Веймара ў ліпені 2007 г.:

WALTER BOURQUAIN
BRIGITTE BURCKHARDT
RAINER DÖNNECKE
DR. DIETER ECKARDT
DR. GERT EISENWINDER
HEINZ FISCHER
HARALD FREUDENBERG
MONIKA GLIMM
CORINA HARKE
DR. THOMAS HARTUNG
MICHAEL HASENBECK
HORST HASSELMANN
DR. HANS HEUZEROTH
PROF. DR. WOLFGANG HÖLZER
STEPHAN ILLERT
RUDOLF KESSNER
RALF KIRSTEN
ROBERTO KOBELT
KARL-HEINZ KRAASS
MARTIN KRANZ
DR. PETER KRAUSE
SIEGRUN LOPP
CARSTEN MEYER
DIRK MÖLLER
DR. BERND NOWAK
REGINA PEESS
HARTMUT POHLE
ANNETTE PROJAHN
KLAUS-PETER RUHLAND
KATJA SCHÄFER
MARTINA SCHENK
CLAUS SCHINNER
VRONI SCHMIEDEL
NORBERT SCHREMB
GERHARD SCHWARTZE
GÜNTER SEIFERT
PETRA STREIT
JOACHIM TROMMSDORF
JÜRGEN VENT
STEFFEN VOGEL
PROF. DR. FRANK WERNER
FRANK ZIEGLER